1. Венецианова, М. А. Мастерство актера в терминах и определениях К. С. Станиславского: учеб. пособие / М. А. Венецианова. – М. : Советская Россия, 1961. – 519 с.

2. Захава, Б. Е. Мастерство актера и режиссера: учеб. пособие / Б. Е. Захава. – 4-е изд. – М. : Просвещение, 1978. – 334 с.

3. Станиславский, К. С. Моя жизнь в искусстве: собр. соч.: в 8-ми т. / К. С. Станиславский. – М. : Искусство, 1954. – Т.1. – 514 с.

4. Станиславский, К. С. Моя жизнь в искусстве: [мемуары] / К. С. Станиславский. – М. : АСТ, 2023. – 608 с.

5. Станиславский, К. С. Работа актера над собой в творческом процессе воплощения / К. С. Станиславский. – М. : АСТ, 2024. – 448 с.

Жук Д.С., магістрант
завочнай формы атрымання адукацыі
Навуковы кіраўнік – Лупашка І.Г.,
кандыдат культуралогіі, дацэнт

## ПРЭЗЕНТАЦЫЯ ПАЖАРНАЙ І АВАРЫЙНА-ВЫРАТАВАЛЬНАЙ СЛУЖБЫ БЕЛАРУСІ Ў ЭКСПАЗІЦЫІ МУЗЕЯ ПАЖАРНАЙ І АВАРЫЙНА-ВЫРАТАВАЛЬНАЙ СПРАВЫ

Сёння пажарная і аварыйна-выратавальная службы Беларусі – гэта магутнае падраздзяленне МНС Рэспублікі Беларусь, якое мае сучасную тэхніку і спецыяльнае абсталяванне для працы ў любых складаных сітуацыях. Створаны і функцыянуюць 17 спецыяльных службаў, у тым ліку службы пажаратушэння і аварыйна-выратавальных работ, хімічнай і радыяцыйнай бяспекі, інжынерных

работ, вадалазная, медыцынская, выбухатэхнічная, авіяцыйная, пошукава-выратавальная, парашутна-дэсантная, пантонная, кіналагічная.

На сённяшні дзень Музей пажарнай і аварыйна-выратавальнай справы з'яўляецца найбуйнейшым у нашай краіне зборам матэрыяльных сведчанняў гісторыі і культуры чалавечай дзейнасці ў галіне барацьбы з агнём. Адной з прыярытэтных задач музея з'яўляецца папулярызацыя пажарна-выратавальнай справы і азнаямленне шырокіх слаёў насельніцтва з традыцыямі і гераізмам пажарных.

Будынак музея размешчаны ў адным са старэйшых пажарных дэпо. Першым уладальнікам дэпо ў 1885 г. было Мінскае вольнае пажарнае таварыства (МВПТ), па замове якога яно і было пабудавана. Далейшыя маштабныя змены ў абліччы дэпо ўносіліся ўжо на працягу ХХ ст. У 1911 г. былі дабудаваны куты другога паверха (пры гэтым знік мезанін), а ў 1920-я гг. з'явіўся трэці паверх. Апошні раз поўнамаштабная рэканструкцыя праводзілася ў перыяд з 1994 па 1998 г., пасля чаго будынак набыў сучасны выгляд. Будынак пажарнага дэпо па вул. Гарадскі Вал, д. 12 за сваю шматгадовую гісторыю стаў сведкам мноства падзей. Ён перажыў польскую акупацыю, часы Вялікай Айчыннай вайны, не страціў сваёй прыгажосці і ў савецкі перыяд. У першапачатковы архітэктурны ансамбль уносіліся шматлікія дапаўненні, якія моцна змянілі аблічча будынка. Нязменным заставалася толькі служба гэтага дэпо.

У лютым 1999 года было прынятае рашэнне аб стварэнні музея. На працягу наступных двух гадоў рабочая група сумесна з экспертамі Нацыянальнай акадэміі навук, Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі, а таксама архіваў Беларусі распрацавала навуковую канцэпцыю, вызначыла ключавыя тэмы і экспазіцыйныя рашэнні для будучага музея [3]. Першыя залы экспазіцыі адчыніліся ў 2001 г., у дзень 125-годдзя МВПТ. Паслядоўная работа дазволіла сфарміраваць значныя тэматычныя калекцыі і перайсці да стварэння асноўнай экспазіцыі. 25 ліпеня 2003 года, у дзень 150-годдзя пажарнай службы Беларусі,

музей прадставіў сваім гасцям экспазіцыю «Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь: вытокі, станаўленне і найноўшы летапіс развіцця», размешчаную на трэцім паверсе будынка.

Экспазіцыя музея ахоплівае ўсе этапы развіцця пажарна-выратавальнай службы Беларусі, пачынаючы з эпохі сярэднявечча, калі тушэннем пажараў займаліся гараджане з падручнымі сродкамі, і заканчваючы сучаснай дзейнасцю ратавальнікаў МНС [2].

На другім паверсе музея дзейнічае экспазіцыя, якая дазваляе наведвальнікам пагрузіцца ва ўяўленні нашых продкаў аб вогненнай стыхіі. Тут можна даведацца пра павер'і, звязаныя з тушэннем пажараў, а таксама пра тое, хто забяспечваў абарону ад агню ў эпоху Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Адной з галоўных каштоўнасцяў музея з'яўляецца храмавая ікона «Неапальная Купіна» XIX ст. У сувязі з тым, што выява мае выразную сувязь з агнём, абраз «Неапальная Купіна» здаўна шануецца, як абаронца ад пажараў, аб цудоўным заступніцтве якой маецца шмат паданняў.

Экспазіцыя расказвае таксама пра першыя крокі станаўлення прафесійнай пажарнай службы Беларусі, дэманструе конны ход з асноўным інвентаром, які выкарыстоўваўся для тушэння пажараў у к. XIX – пач. XX ст. Магчымасць надзець каску пажарнага, дазваляе наведвальнікам адчуць сябе часткай гэтай прафесіі. Такі інтэрактыўны элемент робіць экспазіцыю яшчэ больш захапляльнай і запамінальнай. Акрамя таго, наведвальнікі могуць даведацца, якую ролю выконвалі «паляўнічыя» і прасачыць гісторыю пажарнай службы на тэрыторыі Заходняй Беларусі, якая ўваходзіла ў склад Польшчы, а таксама ў БССР у міжваенны перыяд. Таксама ў музеі прадстаўлены манекен камінара, з якім звязана цікавая традыцыя: лічыцца, што калі пацерці яго гузік, гэта прынясе поспех і дапаможа выканаць любое жаданне.

На другім паверсе выкарыстоўваюцца QR-коды пад экспанатамі і сучасныя мультымедыйныя ўстаноўкі, якія забяспечваюць дадатковую інтэрактыўнасць і

паглыбляюць успрыманне прадстаўленых матэрыялаў. Наведвальнікі могуць сканаваць QR-коды, каб атрымаць доступ да дадатковай інфармацыі і мультымедыйных матэрыялаў, звязаных з экспанатамі.

На трэцім паверсе размяшчаюцца два памяшканні: кабінет начальніка НКУС (раней НКУС выконваў функцыі Дзяржаўнага пажарнага нагляду) і вялікая зала. У кабінеце наведвальнікі могуць убачыць кафляную печ, арыгінальную мэблю XX ст., старадаўнюю друкаваную машынку, радыё, тэлефон, Вялікую савецкую энцыклапедыю, пісьмовы набор, аптэчку і інш.

Экспазіцыя вялікай залы апісвае развіццё пажарнай службы ў пасляваенны перыяд. Асобны раздзел прысвечаны найбуйнейшай тэхнагеннай катастрофе XX ст. – аварыі на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі. Дэманструюцца дакументальныя фільмы, дзякуючы якім можна ўбачыць не толькі працу ліквідатараў падчас катастрофы, але і сучасны від горада Прыпяці. Аднымі з галоўных экспанатаў музея з'яўляюцца формы ратавальнікаў: «Шторм», якая з’яўляецца непрамакальнай; цеплазмяшчальны касцюм, у якім можна блізка падысці да полымя; паўсядзённая і парадная форма савецкага перыяду (1980-х гг.); форма пач. 1990-х да 1996 гг.

Экспазіцыя прадстаўляе матэрыялы аб стварэнні Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь і шэрагу спецыяльных службаў: пажаратушэння і аварыйна-выратавальных работ, хімічнай і радыяцыйнай абароны, вадалазна-выратавальная, медыцынская, выбухатэхнічная, авіяцыйная, пошукава-выратавальная і кіналагічная. Сярод найбольш атрактыўных экспанатаў – муляжы машыны медыцынскай службы МНС і пажарнай машыны ў сапраўдных памерах з сучасным пажарным інвентаром.

Інтэрактыўная частка музея – гэта зоны авіяцыі і выбухатэхнічнай службы. У зоне авіяцыі наведвальнікі могуць убачыць мадэлі верталётаў, якія выкарыстоўваюцца выратавальнымі службамі. Адмысловую цікавасць выклікае магчымасць сесці ў кабіну пілота, каб адчуць сябе ў ролі кіраўніка верталёта. Тут

наведвальнікі могуць не толькі вывучыць прылады кабіны, але і даведацца аб тым, якія задачы выконваюць пілоты і як авіяцыя дапамагае ратавальнікам спраўляцца з надзвычайнымі сітуацыямі ў складаных і экстрэмальных умовах.

У зоне, прысвечанай выбухатэхнічнай службе, наведвальнікі могуць не толькі азнаёміцца з абсталяваннем, але і асабіста скарыстацца чамаданам узрывальніка, каб зразумець, як працуюць спецыялісты ў гэтай галіне. Акрамя таго, дэманструюцца відэаролікі, якія паказваюць розныя этапы і метады правядзення выбуховых работ.

Музей мае старонку на сайце Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, дзе прапануецца прайсці віртуальны тур па экспазіцыйных залах музея. 3D-падарожжа створана пры дапамозе сканіравання прасторы панарамнай камерай. Рэалістычная візуалізацыя таго, што адбываецца, дазваляе стварыць уражанне прысутнасці на аб'екце [1].

Музей пажарнай і аварыйна-выратавальнай справы Беларусі ўяўляе сабой унікальную прастору, дзе гісторыя, сучаснасць і інтэрактыўныя тэхналогіі пераплятаюцца, каб падкрэсліць значнасць прафесіі пажарных і ратавальнікаў. Экспазіцыя музея дазваляе не толькі даведацца пра гісторыю станаўлення пажарнай службы, але і адчуць сябе на месцы ратавальнікаў.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Виртуальная эскурсия // ЦИИР БГУИР. – 2021. – URL: https://www.bsuir.by/online/3D/mchs/virtual/index.html (дата обращения: 14.03.2025).

2. Музей пожарного и аварийно-спасательного дела // Министерство по чрезвычайным ситуациям Республики Беларусь. – URL: https://mchs.gov.by/ministerstvo/napravleniya-deyatelnosti/istoriya-pozharnogo-dela/muzey-mchs/?ysclid=m8mthxgc14358643304 (дата обращения: 14.03.2025).

3. Тетерник, А.В. Страницы истории пожарной службы / А.В. Тетерник, В.И. Яковчук; под ред. В.А. Ващенко [и др.]. – Минск: Тэхналогія, 2014. – 191 с.

Жуковская М.В., студент 703 группы
заочной формы получения образования
Научный руководитель – Самерсова Н.В.,
кандидат педагогических наук, доцент

## ВЛИЯНИЕ НЕГАТИВНЫХ ЭМОЦИОНАЛЬНЫХ СОСТОЯНИЙ НА МЛАДШИХ ШКОЛЬНИКОВ КАК СОЦИАЛЬНО-ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРОБЛЕМА

В настоящее время мы столкнулись с проблемой, в которой значительная часть школьников испытывает трудности в обучении и коммуникации в школе. Исследования, проведённые ЮНИСЕФ совместно с Министерством образования и Министерством здравоохранения Республики Беларусь, показывают, что учащиеся сталкиваются с различными внутренними переживаниями: 49,2% испытывают чувство одиночества; 43,4% находятся в конфликтах с родителями; 36,3% ощущают отсутствие смысла жизни; 26,36% испытывают трудности с учебой [7].

Многие исследователи (Л. С. Выготский, А. Н. Леонтьев, Л. Я. Гальперин, Д. Б. Эльконин, В. В. Давыдов, А. В. Петровский и др.) обращают внимание на то, что психическое развитие ребёнка формируется при эмоциональной стабильности и благополучии. Изучая научную литературу по вопросу сущности и особенностей влияния эмоциональных состояний на младших школьников, мы можем сделать вывод о том, что эмоции оказывают